# Прамова дэпутата Панамарэнка П. К.

Таварышы дэпутаты Вярхоўнага Совета! Мы заслухалі заяву Поўнамоцнай Камісіі Народнага сейма Літоўскай рэспублікі з просьбай аб уключэнні Літоўскай Совецкай Социялістычнай Рэспублікі ў састаў Совецкага Саюза.

З велізарнай увагай выслухалі дэпутаты Вярхоўнага Совета Саюза Совецкіх Социялістычных Рэспублік палкія прамовы членаў Поўнамоцнай Камісіі Народнага сейма Літвы, выразіўшых пачуцці, спадзяванні і волю вызваленага літоўскага народа, перадаўшых пачуццё гарачай любві вялікаму совецкаму народу, Вярхоўнаму Совету, нашаму ўраду, нашай вялікай партыі, вялікаму правадыру і настаўніку нашага Саюза—таварышу Сталіну. **(Бурныя, працяглыя апладысменты).**

Гэтыя жаданні і волю літоўскі народ выразіў на выбарах дэпутатаў у Народны сейм, аднадушна аддаўшы свае галасы за кандыдатаў Саюза працоўнага народа Літвы.

Гэта воля літоўскага народа выражана ў аднадушным рашэнні Народнага сейма аб устанаўленні совецкай улады ў Літве і аб уступленні Літвы ў састаў Совецкага Саюза.

Гэта воля была пацверджана ўсім народам на шматлікіх мітынгах і сходах у гарадах і сёлах Літвы.

З самага пачатку існавання Літоўскай рэспублікі Саюз Совецкіх Социялістычных Рэспублік заўсёды і нязменна паважаў і адстойваў суверэнныя правы, незалежнасць і безапаснасць Літвы.

Совецкі Урад першы прызнаў стварыўшуюся Літоўскую дзяржаву і перадаў ёй у 1920 годзе значную частку былой Віленскай губерніі і горад Вільна.

Калі польскія войскі, якія ўварваліся на тэрыторыю Літвы, захвацілі горад Вільна, Совецкі Урад быў адзіным урадам, які выразіў рашучы пратэст супроць разбойніцкіх дзеянняў панскай Польшчы і ніколі не прызнаваў законнасці захвату палякамі Вільны.

У 1926 годзе Совецкі Саюз заключыў з Літвой дагавор аб ненападзе.

У 1927 годзе дзякуючы энергічнаму ўмяшанню Совецкага Саюза была поўнасцю прадухілена ўзнікшая рэальная пагроза ваеннага нападу Польшчы на Літву. Гэтак сама і ў сакавіку 1938 года Совецкі Саюз прадухіліў напад Польшчы на Літву.

ПРЭЗІДЭНЦКАЯ БІБЛІЯТЭКА РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

Калі Рабоча-Сялянская Чырвоная Армія ў другой палавіне верасня 1939 года пасля распаду польскай дзяржавы працягнула руку дапамогі народам Заходняй Беларусі і Заходняй Украіны, яна ў той-жа час узяла пад сваю абарону адторгнутую Польшчай ад Літвы Віленскую вобласць.

Вызваліўшы горад Вільна і Віленскую вобласць ад белапольскіх акупантаў, Савецкі Урад аднавіў папраныя правы Літвы і звярнуў Літве горад Вільна і Віленскую вобласць. Савецкі Урад лічыў, што Вільна павінна належаць Літве, як горад, з якім звязаны гістарычнае мінулае Літоўскай дзяржавы і нацыянальныя спадзяванні літоўскага народа.

У сусветнай гісторыі не было іншага такога прыкладу, каб вялікая магутная дзяржава па ўласнай волі аддавала малой дзяржаве такі вялікі горад. Тым ярчэй гэты факт дэманстрыруе міралюбнасць і дружбу Вялікай Савецкай Дзяржавы. **(Бурныя апладысменты).**

І, нарэшце, пакт аб узаемадапамозе 1939 года, заключаны Саюзам Савецкіх Сацыялістычных Рэспублік з Літвой, і ўвод савецкіх войск у Літву мелі мэтай стварыць умовы для бяспечнага існавання Літоўскай дзяржавы, служыць справе збліжэння Літвы з Савецкім Саюзам. Аднак прадаўшыяся замежнаму капіталу буржуазныя палітыкі, усеўшыяся на спіну літоўскага народа, сталі ўслужліва ператвараць Літву ў плацдарм для нападу на Савецкі Саюз, сталі ствараць ачагі міжнароднай правакацыі, распальваць антысавецкую агітацыю. Сметонаўскія халопы імперыялізма, утапаўшыя ў раскошы і распусце, прыгнятаўшыя і пагружаўшыя ў галечу літоўскі народ, не былі зацікаўлены ў выкананні пакта. Яны імкнуліся да таго, каб Літоўская дзяржава стала адсталым аграрным прыдаткам капіталістычных краін. Яны ўсімі сіламі адгароджвалі Літву бар'ерам ад Вялікага Савецкага Саюза. Яны сталі замышляць і праводзіць гнусныя правакацыі супроць часцей Чырвонай Арміі, сталі на шлях арганізацыі ваеннага саюза супроць СССР. Гэта была палітыка разлажыўшыхся і прадажных правіцеляў. Гэту палітыку таксама, як і саміх правіцеляў, ненавідзеў народ. Літоўскі народ уважліва сачыў за тым, што адбываецца ў нашай вялікай краіне. Ён горача палюбіў нашу Савецкую дзяржаву рабочых і сялян. Мысль аб савецкай Літве наспявала ў масах пад цяжкім гнётам сметонаўскага рэжыма. З бязмежнай любоўю рабочыя і сяляне Літвы называлі імёны Леніна і Сталіна. Народ змёў ненавісны сметонаўскі рэжым. Працоўныя Літвы не пажадалі, каб памешчыкі і фабрыканты стаялі на чале народа, прыкрываліся яго іменем. Яны захацелі стаць і сталі самі гаспадарамі свайго лёсу. **(Апладысменты).**

З поўным тэкстам дакумента можна азнаёміцца ў бібліятэцы